Падтрымай "Вясну" на PATREON

Два з паловай гады "хіміі" і тысяча рублеў кампенсацыі: берасцейца асудзілі за "негатыўную ацэнку" супрацоўніка РАУС

06.04.2021 **Тэгі**: суды, крымінальны пераслед, адміністратыўны пераслед, грамадства, ціск



Аляксандр Кашпанаў у судзе

Шостага красавіка ў судзе Брэсцкага р-на вынеслі прысуд 33-гадоваму Аляксандру Кашпанаву. Яго прызналі вінаватым па артыкуле 369 Крымінальнага кодэксу і асудзілі да двух з паловай гадоў "хіміі" (абмежаванне волі з накіраваннем у выпраўленчую ўстанову адкрытага тыпу).

Справу разгледзеў суддзя **Сяргей Маручак**. Дзяржабвінавачанне прадстаўляў пракурор **Шастачук**.

У чым прызналі вінаватым?

13 верасня 2020 года Кашпанаў размясціў улёткі ў "неналежным" месцы: за гэта Аляксандру быў прызначаны штраф у 25 базавых велічынь. Але па версіі дзяржабвінавачання, ва ўлётках ёсць падставы для крымінальнай справы: звесткі абразлівага характару ў дачыненні да супрацоўніка Ленінскага РАУС Брэста **Андрэя Хвесюка**. Тэкст улёткі пра Хвесюка быў узяты з аднаго з телеграм-канала. Там сцвярджалася, што міліцыянт *"пасля затрыманняў 9-11 жніўня асабіста збіваў затрыманых*

у спартзале за тое, што яны няправільна стаялі перад ім на каленях". Таксама Хвясюк называўся "*капітанам гестапа*". **На судзе міліцыянт заявіў пазоў на 1000 рублёў для кампенсацыі яму маральнай шкоды: суддзя задаволіў пазоў.**

Усяго, як паведаміла дзяржабвінавачанне, было расклеена 14 улётак. Рабіў Кашпанаў гэта не ў адзіночку, а ў "групе асоб па папярэдняй змове". Крымінальная справа ў дачыненні да "напарніка" выдзелена ў асобную справу.

Што адбывалася на паседжанні?



Ілюстрацыя валанцёркі "Вясны": суддзя Маручак і дзяржабвінаваўца Шастачук на судовым пасяджэнні пятага красавіка 2021


Віна Кашпанава, згодна з дзяржабвінавачаннем, пацвярджаецца ў тым ліку "*копіяй пастановы са справы аб адміністрацыйным правапарушэнні*". І заключэннем экспертызы, што тэкст утрымлівае "*негатыўную ацэнку*" грамадзяніна Хвесюка. Сведкі ж на паседжанне не з'явіліся.


Свае дзеянні Кашпанаў патлумачыў тым, што пасля выбараў у яго пастаянна перад вачыма была інфармацыя аб негатыўных дзеяннях супрацоўнікаў міліцыі.


Пракурор запрасіў для абвінавачанага Кашпанава **два з паловай гады "хіміі" (**абмежавання волі з накіраваннем у выпраўленчую ўстанову адкрытага тыпу). Суддзя Маручак вынес менавіта такі прысуд. Таксама пракурор прапанавала суду пакінуць арышт на аўтамабіль Кашпанава, як меру забеспячэння выплаты грамадзянскага пазову ад Хвесюка.

Твитнуть


#FREEVIASNA


Вясна. Правы чалавека ў …
9 921 "Нравится"
ВЯСНА
Нравится
Свяжитесь с нами


СВАБОДА МІРНЫХ СХОДАЎ
Рэпрэсаваны “Чарнобыльскі шлях". Як шэсце памяці апынулася чарговай нагодай для ціску
"Катаванні сталі ў Беларусі звычайнай справай". Беларускія праваабаронцы — на канферэнцыі АБСЕ
Будаўніка асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у Маршы
Заява праваабаронцаў Беларусі аб прызнанні дзевяці палітычных зняволеных
WWW.GAZETABY.CO




ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА

"Калі адказ не падабаўся, то білі". У СІЗА-1 падчас жорсткай праверкі збівалі вязняў

Палітвязня Вадзіма Гурмана, які мае сур'ёзныя праблемы са зрокам, катуюць у горацкай калоніі

"Гэта была аддушына — сустрэць свайго аднадумца", — былыя палітвязні пра этап у адным вагоне

"КДБ думаў, што мы ботаферма", — былая палітзняволеная па "справе Зельцэра"




ГАЛОЎНАЕ


Рэпрэсаваны "Чарнобыльскі шлях". Як шэсце памяці апынулася чарговай нагодай для ціску



#ВолюВясне



ПАЛІТЫЧНЫЯ ЗНЯВОЛЕНЫЯ



Спіс палітычных вязняў

АПОШНІЯ НАВІНЫ

"Народжаная пад дубінкамі на Чарнобыльскім шляху". Як пачыналася "Вясна"

Затрыманні і арышты: хроніка палітычнага пераследу 24-26 красавіка (дапоўнена)

Мужчыну асудзілі за ўдзел у Маршы і бойку з прычыны "палітычнай абстаноўкі" у 2020 годзе

У Мінску судзяць стрыечнага брата намесніка камандзіра палка Каліноўскага Вадзіма Кабанчука: пракурор просіць тры гады калоніі

"У думках з тымі, хто сустракае гэты дзень за кратамі". Міжнародная супольнасць віншуе “Вясну” з днём народзінаў

Мужчыну асудзілі на год "хіміі" за сарваны сцяг

"Мы не хочам быць заложнікамі", – вясноўцы на акцыі ў Вільні

Ліквідацыя, арышты, суды і выгнанне. Праз 27 гадоў рэпрэсій "Вясна" працягвае сваю дзейнасць

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Ліквідацыя, арышты, суды і выгнанне. Праз 27 гадоў рэпрэсій "Вясна" працягвае сваю дзейнасць

ВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ







ПАРТНЁРСТВА

Рацыя

kamunikat
Беларуская інтэрнэт-бібліятэка

Вытокі

ADC Memorial
Anti-Discrimination Centre

СЯБРОЎСТВА

ENEMO
European Network of Election Monitoring Organizations

HUMAN RIGHTS HOUSE NETWORK

fidh

E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

CC BY